*Печка* была зімовым курортам, пра гэта ў „Тарасе на Парнасе“ — Зэўс „грэў на *печы* стары плечы ды нешта ў барадзе шукаў“. Альбо ў народных прыпеўках: „А на *печы* пры лучыне дзеўкі грошы палічылі, налічылі шастака і купілі мужыка. А на *печы* пры лучыне маці грошы палічылі, налічылі кучку і купілі сучку“. Асучасьненая *печ* — гэта грубка, пазьней камін. Клалі печы *печнікі*, сапраўды на *печы* добрыя рэчы. Печ ласкава грэе і ўспаміны.

# Піва

***Аляксандар Лукашук***

Халоднае, сьвежае, неразбаўленае, густое, бурштынавае, бочкавае, пеннае — памятаеце рэкляму: *піце піва пеннае*!

Што добра пад *піва*? Сушаны лешчык, салёны абаранак, вараныя ракі, сяброўская гутарка пра ўсё на сьвеце.

*Піва* прыдатнае для ацэнак: *зь ім піва ня зварыш* — не дагаворышся, не паразумеешся. А вось выправіцца *„да Абрама на піва“* значыць — да праайцоў, на той сьвет. Хоць на тым сьвеце, паводле наяўных зьвестак, *піва* няма — там амброзія (тым, хто заслужыў). У Бібліі *піва* ня згадваецца ані разу, хоць у Чэхіі можна купіць куфаль з тэкстам *піўнога* варыянту малітвы „Ойча наш“.

*Піўніцай* на пачатку XX стагодзьдзя ў Беларусі называлі адмысловы склеп для захоўваньня *піва*, квасу, малака, гародніны; *піўніцы* былі драўляныя і мураваныя. *Піва* зь *піўніцы*, пэўна, смачнейшае, чымся зь сёньняшняй жалезнай лядоўні.

Бровары — даўняя прыкмета беларускіх мястэчак. Неяк адзін слуцкі патрыёт хваліўся: раней казалі „*піва* няма, толькі слуцкае“, а цяпер слуцкае піва — самае смачнае. *Піва* ня ёсьць нацыянальны напой для беларусаў, як для чэхаў ці баварцаў, дзе вараць тысячы гатункаў і выпіваюць сотні літраў за год, наладжваюць *піўныя сьвяты* ды *піўныя путчы*. Але ў Беларусі апошнім часам *піва* становіцца прадметам нацыянальнай гордасьці: наша *піва* — лепшае за расейскае, смачнейшае за польскае, таньнейшае за літоўскае.

*Піва* — паказчык таго, што ўсё ў парадку, паціху, як цяпер кажуць — нармалёва.

*Хадзем на піва!*

# Пляцоўка

***Анатоль Вярцінскі***

Дзіцячая, будаўнічая, стартавая і пасадачная... Меншая сястра *пляца*. Праўда, зь іншым функцыянальным прызначэньнем.

Калі ўзяць *пляцоўку дзіцячую*, то ў адрозьненьне ад *пляца*, які мае часамусьці ўласьцівасьць ператварацца іншым разам з *пляца* Волі, Незалежнасьці ў *пляц* няволі і залежнасьці, быць месцам, дзе дарослыя дзядзькі — яны ж правадыры — праводзяць ваенныя парады ды ладзяць агляды сваіх сілаў на страх унутраным і замежным ворагам, — у адрозьненьне ад гэтага, *дзіцячая пляцоўка* зь яе горкамі, лесьвічкамі, карусэлямі зьяўляецца, наадварот, месцам, дзе юныя грамадзяне могуць свабодна гуляць і забаўляцца, ды